# УВОДЗІНЫ

**Правапіс** – гэта сукупнасць агульнапрызнаных і агульнаабавязковых правіл, якія вызначаюць спосабы перадачы мовы на пісьме. Правапіс уключае ***арфаграфію*** (гр. *orthographia*, ад *orthós* 'правільны' і *gráphō* 'пішу') і ***пунктуацыю*** (лац. *punctuatio* ад лац. *punctum* 'кропка'). Сістэма правіл складаецца гістарычна і адлюстроўвае як даўнія традыцыі, так і новыя тэндэнцыі ў перадачы гукаў, слоў і форм, што выяўляюцца ў пісьмовай мове на розных этапах яе развіцця.

У лінгвістычнай літаратуры тэрмін ***арфаграфія*** мае тры асноўныя значэнні.

**Арфаграфія** – 1) сістэма аднастайных напісанняў слоў, якая выкарыстоўваецца ў пісьмовым маўленні; 2) правілы аднастайнай перадачы пісьмовага маўлення; 3) раздзел мовазнаўства, у якім вывучаецца і распрацоўваецца сістэма арфаграфічных правіл. Часам тэрміны ***арфаграфія*** і ***правапіс*** выкарыстоўваюцца як сінанімічныя.

Напісанні слоў не аднатыпныя, таму і ў самой арфаграфіі вылучаецца некалькі адносна самастойных частак. Так, арфаграфія:

✓ вызначае правілы перадачы на пісьме гукавога складу асобнага слова ці значымых частак слова (кораня, прыстаўкі, суфікса, канчатка);

✓ устанаўлівае правілы ўжывання вялікай і малой літары;

✓ рэгламентуе правілы злітнага, паўзлітнага (праз дэфіс) і раздзельнага напісання слоў;

✓ упарадкоўвае правілы графічнага скарачэння і пераносу слоў.

Сучасная беларуская арфаграфія пабудавана на чатырох асноўных прынцыпах – фанетычным, марфалагічным, традыцыйным (гістарычны) і дыферэнцыйным (ідэаграфічны).